**Л.М.Рагачова,** *дацэнт*

# СТАНАЎЛЕННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БУДУЧЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ У ПРАЦЭСЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Неабходнасць перабудовы сістэмы выхавання падрастаючага пакалення ўсведамляецца сёння на ўсіх узроўнях. Галоўныя кірункі гэтай перабудовы закладзены і ажыццяўляюцца ў рамках рэформы агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы. Яе вядучай метадалагічнай асновай выступае пераарыентацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу на асобу вучня, на стварэнне для кожнага навучэнца найбольш спрыяльных умоў развіцця на падставе асобасна арыентаванага вучэбнага працэсу.

Ажыццяўленне прынятага вектара аднаўлення сістэмы адукацыі немагчыма без істотных змен у агульнай падрыхтоўцы і дзейнасці педагога, роля якога значна мяняецца: ад маналагічнага прынцыпу арганізацыі працэсу навучання ён пераходзіць да дыялагічнага, ад транслятара вучэбнага матэрыялу — да арганізатара самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Падрыхтоўка настаўніка павінна ўлічваць высокія тэмпы пераўтварэнняў у грамадскай, палітычнай, культурнай сферах соцыуму, фарміраваць у яго

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

здольнасці і патрэбнасць пастаяннага папаўнення атрыманых ведаў, іх мадэрнізацыі ў сувязі з новымі кірункамі ў развіцці грамадства. Вызначальнай структурнай адзінкай такога фарміравання спецыяліста становіцца актывізацыя яго самастойнага мыслення, крэатыўнага ўспрымання рэчаіснасці, рэфлексіўных адносін да асабістай дзейнасці, што адлюстроўвае ролю адукацыі ў развіцці грамадства.

Такім чынам, сучасныя патрабаванні да педагагічнай дзейнасці прадугледжваюць наяўнасць высокага ўзроўню прафесійнага майстэрства і педагагічнай культуры настаўніка, якія фарміруюцца ў працэсе мэтанакіраванай самастойнай работы студэнта ў час навучання ва універсітэце.

Сістэмны падыход да аналізу педагагічнай культуры дазваляе вылучыць найбольш значныя яе якасці:

— шырокі навуковы светапогляд;

— глыбокія псіхолага-педагагічныя веды і ўменні;

— высокі ўзровень прафесійных ведаў (па прадмеце выкладання);

— кіраўніцкія здольнасці.

Відавочна, што набыццё ўказаных якасцей можа быць дасягнута толькі ў працэсе актыўнай самастойнай дзейнасці асобы, таму што ў гэтай дзейнасці забяспечваецца найбольш поўны ўлік індывідуальных асаблівасцей студэнта, ажыццяўляецца стымуляванне яго пазнавальнага інтарэсу, фарміруецца патрэбнасць самастойнага мыслення, творчага падыходу да вырашэння праблем.

У педагагічнай навуцы ўсталявалася сістэма ўзроўняў самастойнай работы студэнтаў па ступені іх складанасці:

— узнаўленне па ўзоры;

— рэканструкцыйна-пераўтваральныя ўменні;

— часткова-пошукавыя работы;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— даследчыцкія, творчыя работы, заданні (гл., напрыклад: Пидкасистый И.П. Самостоятельная деятельность учащихся. — М., 1972. — С.43 ).

Кожны з адзначаных узроўняў патрабуе пэўнай пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці будучых спецыялістаў. Але, як сведчыць практыка, комплекснае выкарыстанне розных тыпаў заданняў забяспечвае цэласны падыход да развіцця і станаўлення педагагічнага майстэрства і культуры студэнтаў. Фарміраванне блоку самастойных заданняў з улікам іх складанасці і адпаведнасці ўзроўню гатоўнасці студэнтаў дазваляе забяспечыць паслядоўны падыход у станаўленні педагагічнай культуры спецыялістаў, стварае ўмовы для асэнсаванага падыходу да педагагічнай дзейнасці як аднаго з магчымых варыянтаў самарэалізацыі.

Разам з тым неабходна адзначыць, што зыходныя пазіцыі асобных студэнтаў, з пункту гледжання іх псіхалагічнай гатоўнасці і навыкаў арганізацыі і выканання самастойнай работы, значна адрозніваюцца. Частка з іх не атрымала на школьнай ступені навучання адпаведных уменняў, што негатыўна ўплывае на ўласную самаацэнку і прафесійную самаідэнтыфікацыю. У сувязі з гэтым педагагічна мэтазгодна ў першыя тыдні навучання на першым курсе правесці праверку ўзроўню сфарміраванасці ўменняў па арганізацыі і выкананні самастойнай работы. Такая праверка можа адбыцца ў межах курса “Уводзіны ў спецыяльнасць”, які ўключае педагагічны блок. Формай праверкі можа стаць агульнае для ўсіх студэнтаў заданне па самастойным стварэнні плана-канспекта параграфа дапаможніка ці навуковага артыкула, які даступны па сваім змесце для ўспрымання першакурснікамі. Вынікі праведзенай работы з’явяцца аб’ектыўнай базай у мадэляванні выкладчыкамі сістэмы самастойнай работы, арыентаванай на актыўнае развіццё спецыяльных і агульных здольнасцей да педагагічнай дзейнасці.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У прафесійным аспекце фарміравання педагагічнай культуры будучых выкладчыкаў найбольш сістэмнымі выступаюць рэфлексіўна- аналітычныя, праектна-тэхналагічныя і арганізацыйна-кіраўніцкія здольнасці (гл.: Жук А.І. Настаўнік і рэформа школы // Адукацыя і выхаванне. — 2000. — № 1.).

Рэфлексія як працэс асэнсавання ўласнай свядомасці, уласнай дзейнасці, самапазнання ўласнага "Я" выступае важнай умовай педагагічнай дзейнасці. Без дастатковага ўзроўню авалодання гэтымі здольнасцямі дзейнасць педагога будзе мець аднабаковы, аўтарытарны характар, што зніжае пазнавальную актыўнасць вучняў і збядняе вучэбна-выхаваўчы працэс.

Значныя магчымасці ў развіцці прыёмаў рэфлексіі ў студэнтаў утрымлівае самастойная работа. Незалежна ад тыпу і складанасці самастойнай работы працэс рэфлексіўна-аналітычнай дзейнасці прысутнічае на ўсіх яе ўзроўнях. Ён выяўляецца ў фарміраванні такіх новаўтварэнняў, як усведамленне неабходнасці вывучэння канкрэтнага матэрыялу для будучай прафесіі, у канстатацыі ўласных адносін да прадмета і асэнсаванні іх уздзеяння на вынікі працэсу навучання, у фарміраванні ўменняў актыўна асэнсоўваць матэрыял, усебакова яго аналізаваць, знаходзіць памылкі ў прынятым рашэнні, а таксама высвятляць асабістыя якасці, якія спрыяюць арганізацыі педагагічнай дзейнасці ці негатыўна ўплываюць на яе. Як сведчаць пералічаныя кірункі рэфлексіі, яна ахоплівае абодва бакі фарміравання педагагічнай культуры студэнтаў — і прафесійна-змястоўную, і асобасна-якасную, забяспечваючы цэласнае развіццё асобы.

Для развіцця праектна-тэхналагічных здольнасцей будучых выкладчыкаў больш значныя магчымасці ўтрымліваюцца ў самастойных работах трэцяга і чацвёртага ўзроўняў, дзе, акрамя засваення матэрыялу, патрабуецца яго творчая перапрацоўка ў адпаведнасці з зададзенай мэтай. Галоўная дыдактычная задача самастойнай работы гэтага тыпу — фарміраванне ведаў і

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

уменняў для вырашэння нетыповых задач, якія патрабуюць пераносу набытых раней ведаў, іх мадэлявання. Выконваючы розныя аперацыі з засвоенымі ведамі, ажыццяўляючы іх рэканструкцыю ў новых умовах, студэнт вучыцца пераўтвараць і даваць тлумачэнні логіцы і зместу сваёй дзейнасці ў канкрэтнай сітуацыі, распрацоўваць найбольш аптымальныя тэхналогіі дасягнення зададзеных мэт, рабіць неабходныя абагульненні пры аналізе сітуацыі. Значным момантам у арганізацыі гэтага тыпу самастойнай работы студэнтаў выступае кантроль выкананых заданняў. Найбольш эфектыўнай формай кантролю ў дадзеных абставінах з'яўляецца абарона самастойна распрацаванай тэхналогіі на семінарскіх занятках. У працэсе яе студэнту неабходны не толькі ўменні лагічна выкласці сваю пазіцыю, але здольнасць да дыскусіі, прыняцця крытычных заўваг з боку як выкладчыка, так і студэнтаў. Несумненна, дадзены від самастойнай работы цалкам накіраваны на фарміраванне прафесійна-практычнага мыслення, развіццё педагагічных здольнасцей, а таксама на фарміраванне асобасных якасцей навучэнца (гуманістычнай накіраванасці, павагі да іншага пункту гледжання, эмацыянальнай устойлівасці, крэатыўнасці і інш.).

Трэці кампанент педагагічнай культуры будучых настаўнікаў — авалоданне арганізацыйна-кіраўніцкімі ўменнямі і навыкамі, без якіх немагчыма рэалізацыя ніводнага, самага якаснага педагагічнага праекта.

Арганізацыйная дзейнасць педагога прадугледжвае арганізацыю асобаснай дзейнасці (самаарганізацыю), дзейнасці калектыву (групы), кіраванне ёю, а таксама аб'яднанне гэтых кірункаў. Найбольш значнымі ў ажыццяўленні гэтай дзейнасці выступаюць этапы прыняцця рашэння, яго выканання і праверкі.

Зыходзячы са зместу названых этапаў, можна сцвярджаць, што самаарганізацыйныя навыкі студэнтаў фарміруюцца на

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

падставе выканання ўсіх тыпаў самастойнай работы і ў залежнасці ад накіраванасці асобы студэнта, яго аксіялагічных каштоўнасцей дасягаць рознага ўзроўню развіцця. Больш складаным з'яўляецца засваенне навыкаў арганізацыі дзейнасці групы або асобы (вучня, удзельніка мастацкага калектыву ці студыі) і кіравання ёю. На гэтай ступені патрабуюцца высокі ўзровень сінтэзу прафесійных і асобасных якасцей выкладчыка, здольнасць да інтэграцыі ведаў з розных галін навукі, уменні выбарачна актуалізаваць асобныя блокі ведаў, прыстасоўваць іх да ўзроўню падрыхтаванасці калектыву ці асобы выхаванца. На фарміраванне названых уменняў накіраваны заданні па самастойнай рабоце чацвёртага тыпу, якія звязаны з даследчыцкімі, творчымі відамі дзейнасці. У працэсе станаўлення педагагічнай культуры студэнтаў нашага універсітэта гэта рэалізуецца падчас напісання курсавых работ па педагогіцы, якія прадугледжваюць як тэарэтычнае засваенне і асэнсаванне праблемы, так і практычную рэалізацыю распрацаванай методыкі з далейшым навуковым абгрунтаваннем атрыманых вынікаў і іх якаснай інтэрпрэтацыяй.

Якаснае выкананне самастойнай работы вышэйшага ўзроўню патрабуе навыкаў вывучэння аўдыторыі, яе інтарэсаў, адпаведнага ўзроўню ведаў і выхаванасці, узаемадзеяння ў калектыве з наступным выкарыстаннем атрыманых матэрыялаў у арганізацыі сумеснай дзейнасці калектыву, высвятленні блізкіх і далёкіх перспектыў у яго развіцці. Пры выкананні самастойных заданняў, звязаных з рэальным педагагічным працэсам, неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на адказнасць студэнта за праведзеныя ім дзеянні, за іх уплыў на індывідуальны працэс развіцця кожнага вучня, што стварае базу гуманістычнай культуры асобы выкладчыка.

Кожнаму з названых блокаў самастойнай работы ўласцівыя свае функцыі ў працэсе фарміравання педагагічнай культуры

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

будучых выкладчыкаў, але іх эфектыўнасць значна ўзрастае пры сістэмным падыходзе да арганізацыі самастойнай работы, калі ўсе яе этапы і ўзроўні будуюцца на падставе прынцыпаў паслядоўнасці, даступнасці, цікавасці і актыўнай дзейнасці саміх студэнтаў. Менавіта такія ўмовы забяспечваюць комплекснае выкарыстанне заданняў у самастойнай рабоце студэнтаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ